«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

Сёння - суды за Беларускі нацыянальны кангрэс (абнаўляецца)

24.05.2016 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Беларускі нацыянальны кангрэс 15 траўня 2016 года.

У судах Менска 24 траўня праходзіць разгляд адміністрацыйных спраў за ўдзел у ва ўстаноўчым сходзе Беларускага нацыянальнага кангрэса, які 15 траўня прайшоў у сталічным парку імя Янкі Купалы. Суддзя суду Ленінскага раёна сталіцы Андрэй Камушкін будзе разглядаць справу пісьменніка і палітыка **Уладзімір Някляева**. Яго вінавацяць ва ўдзеле ў несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве (арт. 23.34 КаАП) і непадпарадкаванню законным патрабаванням супрацоўнікаў міліцыі (арт.23.4 КаАП). Пачатак ў 9-00.

У судзе Цэнтральнага раёна Мінска сёння разглядаюцца справы:

Міколы Аксаміта, артыкулы 23.34 і 23.4 КаАП, суддзя В. Свістунова.

Вячаслава Сіўчыка, артыкулы 23.34 і 23.4 КаАП, суддзя Іван Майсейчык. На суд не з'явіўся, паседжанне перанесенае на 10 гадзін 6 чэрвеня з прымусовым прыводам актывіста на суд.

Станіслава Шушкевіча, артыкул 23.34 КаАП, суддзя В. Шабуня. Сведкі – Алег Лук'янаў, Дзмітрый Шантар. Пастанова – штраф 30 базавых велічынь (6,3 млн. рублёў).

Уладзіміра Яроменкі, артыкулы 23.34, 23.4 і 17.1 КаАП, суддзя В. Шабуня.

Юрыя Лукашэвіча, артыкулы 23.34 і 23.4 КаАП, суддзя А Дзенкевіч, Пастанова - штраф - 15 базавых велічынь.

Генадзя Фядыніча, артыкулы 23.34 і 23.4 КаАП, суддзя А Дзенкевіч.

Мікалая Статкевіча, артыкул 23.34 КаАП, суддзя М. Хома. На суд не з'явіўся.

Зміцера Сільчанкі, артыкул 23.34 і 23.4 КаАП, суддзя М. Казлова, Пастанова - штраф - 30 базавых велічынь. Адзін пратакол накіраваны на дапрацоўку.

Кірыла Цыганка, артыкул 23.34 КаАП, штраф 25 базавых велічынь.

У судзе Фрунзенскага раёна Мінска 24 траўня будуць судзіць і актывіста "Еўрапейскай Беларусі" **Максіма Вінярскага.** Пачатак у 9 гадзін раніцы.

У Маскоўскім судзе вынесена пастанова па арт. 23.34 КаАП ў дачыненні да **Паўла Старавойтава**. Суддзя Таццяна Пірожнікава пакарала актывіста штрафам у памеры 15 базавых велічынь.

Барда і паэта **Зміцера Захарэвіча** будуць судзіць у Заводскім судзе Мінска. Пачатак - 9-00. Захарэвіч на суд не з'явіўся.

Міліцыя не перашкаджала ўдзельнікам кангрэсу, але складала пратаколы на яго арганізатараў і вядомых актывістаў. Паводле назіральнікаў, было складзена больш за 20 пратаколаў на актыўных удзельнікаў. Сярод іх **Мікалай Статкевіч, Вячаслаў Сіўчык, Генадзь Фядыніч, Леанід Кулакоў, Сяргей Мацкойць** ды іншыя.

Опубликовать





СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Заява аб прызнанні 13 чалавек палітычнымі зняволенымі

Жанчыну асудзілі па фота з Маршаў, якія захаваліся на воблачным сховішчы яе тэлефона

Праваабарончы Дзень волі: як у гэтую дату абараняюць правы чалавека

Мінчука за ўдзел у Маршах асудзілі перад студэнтамі БДЭУ



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

Працягваецца ціск у зняволенні: агляд навінаў пра палітвязняў з 27 сакавіка па 11 красавіка

Працягваецца ціск у зняволенні: агляд навінаў пра палітвязняў з 12 па 27 сакавіка

Беларусы на "крытай": як палітвязняў працягваюць пераследаваць у калоніях (дапоўнена)

"Гэтыя каштоўнасці не прыбраць". Як экс-палітвязні святкавалі Дзень волі ў няволі







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2024

Музыкаў гурта Nizkiz асудзілі да 2,5 гадоў "хатняй хіміі"

Заява аб прызнанні 14 чалавек палітычнымі зняволенымі

Затрыманне за каментары, абнаўленне "экстрэмісцкага" спісу: хроніка пераследу 12 красавіка (дапоўнена)

"Свет бачыць і шануе працу "Вясны"". Беларуская праваабаронца выступіла ў Цюрыхскім універсітэце

Новае "экстрэмісцкае фармаванне", журналіст – у спісе "злачынцаў": хроніка пераследу 10-11 красавіка (дапоўнена)

Сімвалічных "хросных" атрымалі палітвязні Кацярына Джыг, Таццяна Курыліна, Алег Завадскі і Юлія Лаптановіч

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2024

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2024

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre memorial

Московская Хельсинкская Группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

СЯБРОЎСТВА

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

european platform for democratic elections
epde









E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

